

# АНДРЭЙ КІМБАР

## Сэнсы кахання і любові

Вершы

***Кімбар Андрэй нарадзіўся 26 верасня 1993 года ў гарадскім пасёлку Варапаева Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, аспірантуру. Выкладае ў Мінскім гарадскім педагагічным каледжы і Беларускім дзяржаўным універсітэце. Вершы друкаваліся ў часопісах «Полымя» і «Маладосць». Аўтар зборніка вершаў «У кроку ад новай вясны».***

✦ ✦ ✦

Апошні трамвай ідзе па маршруце,
а потым зварочвае ў парк.
Па зорных адбітках у лістападаўскіх
лужах
спрабую я вызначыць шлях,
пакуль ты знікаеш у святле ліхтароў.
За поўнач. Наш Менск. Лабірынты.

✦ ✦ ✦

Давай паспрабуем стварыць нешта новае.
Такое, што здзівіць усіх і паўсюль.
Напрыклад, зрыфмуемся спрэс дзеясловамі,
а кропкамі зробім французскі тытунь.

Ці, можа, напішам гісторыю велічы?
Складзём на марозе элегію ростані?
Здаецца, падобнае сніў я надоечы
ці чуў ад паўпрывіднай нечае постаці.

Я зноў не здзівіў вось такой прапановаю?
Любові семантыку ўсё не адолею.
Давай паспрабуем стварыць нешта новае
ці проста патанчым нарэшце пад поўняю.

✦ ✦ ✦

Распушчальная кава
ў папяровае тары.
Не зусім аптымальны
антураж для спаткання.
Зрэшты, сёння сустрэчу
прызначаю з сабой.

Прыгадаць каб былое.
У цішы на сутонні.
Абазначыць наступствы
мною зробленых глупстваў.
Непрынятых рашэнняў
каб прыдумаць фінал.



# КАЦЯРЫНА МІЗЕРЫЯ

## Летнім ранкам

Вершы

***Мізерыя Кацярына нарадзілася 9 лютага 2002 года ў Брэсце. Скончыла філалагічны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна па спецыяльнасці «беларуская філалогія». Працуе рэдактарам. Вершы друкаваліся ў газетах «Кобрынскі веснік», «Зара», «Літаратура і мастацтва», часопісах «Маладосць», «Астрамечаўскі летапіс» і калектыўным зборніку «Берасцейская скарбніца». Лаўрэат рэспубліканскага конкурсу творчай моладзі «Аўтограф», конкурсу маладых літаратараў «Першацвет» і міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычных перакладаў «Берагі сяброўства», дыпламант міжрэгіянальнага паэтычнага конкурсу «Браславская обитель».***

### Тою мовай, што продкі далі

Гэтых крылаў ніхто не зламае,
Яны вытрымаць змогуць усё.
Я з вялікай падзякай прымаю
Усё, што дадзена Музай маёй.

Гэтых крылаў ніхто не падпаліць...
Яны выжывуць, нават ў агні.
Буду вечна зямлю сваю славіць
Тою мовай, што продкі далі.

Тою мовай, якую з дзяцінства
Сагравала на вуснах сваіх.
Дайце ж мне, бы вадой, наталіцца,
Родны верш прачытаўшы услых.

Тою мовай, якую калісьці
Над калыскай анёл нашаптаў,
Прашаптала за вокнамі лісце,
Вецер ціха, бы скарб, перадаў.

Тою мовай, якую ніколі
Не змагу я нічым замяніць.
Праспяваю, бы птушка на волі,
Тою мовай, што продкі далі.

✦ ✦ ✦

Я пачынаю раніцу з усмешкі —
Хай паспрыяе неба мне ў адказ.
Ўвесь свет — такі чароўны і бязмежны...
Мне усміхнецца у жыцці яшчэ не раз.

Я пачынаю раніцу з натхнення,
З дзівосных словаў вечнай цішыні.
З аковаў сну нялёгкага збавення,
З глыточку непаўторнай цеплыні.

Я пачынаю раніцу з малітвы,
З анёламі гаворку я вяду.
Лаўлю ледзь чутныя, нябачаныя рытмы
І п’ю чысцюткую крынічную ваду.

Я пачынаю раніцу з радочка,
Са словаў вечных тонкае душы.
За промнем сонечным імкнуся ціха крочыць
І шчасце вечнае баюся варушыць.

Я пачынаю раніцу з размовы,
Размовы з сонцам, ветрыкам лясным.
З вытокаў, каранёў, сваёй асновы,
Я пачынаю раніцу з вясны...



# ПАЛІНА САЎЛОЎСКАЯ

## Кроў

Аповесць

*Саўлоўская Паліна нарадзілася 6 лютага 2009 года ў Барысаве. Студэнтка факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Піша вершы і прозу. Літаратурны дэбют у «Маладосці».*

Кожнае лета майго дзяцінства пачыналася з дарогі. Доўгай, гарачай, пыльнай, калі аўтобус паўзе па вузкай асфальтавай паласе, а за акном мільгаюць бярозы, хаткі, невялічкія мястэчкі з адным магазінам і бабулямі на лавачках. Заўсёды ведала: калі аўтобус спыніцца і я ўбачу возера, значыць, хутка старажытны Копысь. А там яшчэ паўгадзіны пешкі ці на папутцы — і нарэшце вёска, дзе жывуць бабуля з дзедам. Я лічыла дні да паездкі. Горад — гэта пах асфальту і чужых далоняў у аўтобусе, гэта суседка, якая стукала па радыятары, калі я голасна ўключала тэлевізар, гэта школьны званок, ад якога балела ў вушах. А там, у вёсцы, пахла травой, малаком і свабодай. Я магла бегаць па двары, лазіць па старой грушы, слухаць, як дзед свідруе нешта ў сваёй майстэрні, і назіраць, як бабуля пячэ бліны на вялізнай патэльні. То быў іншы свет, ціхі, павольны, бяспечны. Так мне тады здавалася.

Мне было пяць гадоў, калі ўпершыню заўважыла лес. Нібы я яго не бачыла дагэтуль: ён заўсёды знаходзіўся там, на ўскрайку вёскі, цёмнай сцяной за агароднай пусткай. Але раней проста не звяртала ўвагі. Гэтае лета ўсё змяніла. Мы сядзелі з бабуляй на ганку. Я ела клубніцы з цукрам, і сок цёк па пальцах. Бабуля пляла нешта з нітак. Пальцы яе рухаліся хутка, а вочы глядзелі кудысьці ўбок. Я прасачыла за яе позіркам і ўбачыла лес.

— А што там, за агародамі? — спытала.

Бабуля не адразу адказала. Яна павярнула галаву, паглядзела туды, куды я паказвала пальцам, і яе твар зрабіўся іншым. Не злым, не строгім — проста напружаным. Так глядзяць на нешта, чаго баяцца, але пра што не гавораць. Бабуля перавяла позірк на мяне, і я ўбачыла ў яе вачах нешта новае, цень.

— Лес там,— паведаміла яна нарэшце.

— А можна туды пайсці?

— Не.

Яна сказала гэта так рэзка, што я ажно здрыганулася. Клубніцы выпалі з міскі, пакінуўшы чырвоныя плямы на падоле сукенкі. Бабуля адклала ніткі, павярнулася да

мяне і паглядзела проста ў вочы, хочучы сказаць гэтым нешта важнае. Яна ўзяла маю руку, сціснула яе моцна, ажно пальцам стала балюча.

— Туды не хадзі, унучанька. Ніколі.

— Чаму?

— Там людзі прападаюць.

— Як прападаюць?

Бабуля памаўчала, глянула на лес, потым зноў на мяне.

— Ты ведаеш цётку Марылю? — спытала яна ціха.

Я кіўнула. Цётка Марыля жыла праз два дамы ад нас, заўсёды сядзела на лавачцы, скіраваўшы позірк у адну кропку. Калі я праходзіла міма, тая ніколі не віталася, проста глядзела.

— Яна не заўсёды была такая,— сказала бабуля.— Дваццаць гадоў таму пайшла ў той лес у ягады. Вярнулася праз тыдзень. Нічога не памятала. Ні хто яна, ні дзе яе дом. І вочы сталі іншыя, як у лялькі.

Я схавалася бабулі пад паху, і яна абняла мяне. Пальцы яе дрыжалі.

— Ты мая разумніца,— прамовіла бабуля ціха.— Запомні: лес не для нас.

Але пакуль яна гэта казала, я глядзела ёй цераз плячо. І заўважыла, што сама бабуля глядзела на лес. Доўга. Так, быццам чакала чагосьці, быццам ведала, што рана ці позна ён пакліча.

Той самы год. Лета выдалася гарачым, і я спала з адчыненым акном. Вечарам мяне купалі ў карыце, паілі цёплым малаком і клалі ў ложак, а бабуля заўсёды сядзела побач, пакуль я не засынала, спявала старыя песні, якія я не разумела, але ад іх веяла спакоем.

У тую ноч прачнулася ад таго, што ў пакоі было светла. Не так, як удзень, і не так, як ад месяца. Святло было зялёнае, цьмянае, ішло з-пад дзвярэй і пульсавала: то ярчэй, то слабей, быццам нехта дыхаў ім. Я адчувала яго нават скрозь коўдру. Спачатку проста ляжала і глядзела на гэтую зялёную паласу пад дзвярыма, потым, спалохаўшыся, ціха паклікала:

— Бабуля...

Цішыня. Толькі святло варушылася і холад поўз па падлозе.

Я паклікала грамчэй:

— Бабуля!

І раптам святло знікла, проста ўмомант, быццам яго выключылі. За дзвярыма стала цёмна, але холад застаўся яшчэ на некалькі хвілін. Я доўга не магла заснуць, усё чакала, што яно вернецца.

Раніцой расказала бабулі. Яна стаяла ля печы, мяшала кашу і, калі я пачала гаварыць, замерла з лыжкай у руцэ.

— Святло, кажаш? Зялёнае?

— Ага. З-пад дзвярэй. І холадна было.

Яна памаўчала, потым, не паварочваючыся, сказала:

— Падалося. Гэта месяц.

— Але месяц жоўты,— не здавалася я.— І ад яго не бывае холадна.

Бабуля рэзка павярнулася, падышла да мяне, прысела на кукішкі і схапіла за плечы. Пальцы ў яе былі моцныя, я ажно адчула боль.

— Святла не было. Ты спала і ўсё выдумала. Чуеш? Не было. І нікому пра гэта не кажы, нават дзеду.

Я кіўнула, але бачыла: яна мне не верыць. Дакладней, верыць, што я бачыла святло, але хоча, каб я пра гэта забылася. Праз некалькі дзён бабуля пачала кожны вечар, перад тым як легчы спаць, абыходзіць дом звонку. Я бачыла ў акно, як тая спынялася ля вуглоў, вадзіла рукой па сценах, штосьці шаптала, а аднойчы пасыпала нешта пад вокнамі.

Праз два гады, калі мне было сем, здарылася яшчэ адна дзіўная рэч. Я гуляла на двары. Дзед ладзіў штосьці ў хляве, бабуля пайшла да суседкі. Я сядзела ў пясочніцы, якую дзед зрабіў мне з дошак, і будавала горад з галінак і каменьчыкаў. Калі падняла галаву, убачыла яе.

Дзяўчынка стаяла за плотам, там, дзе агарод выходзіць на пустку, а за ёй пачынаецца лес. Яна стаяла і проста глядзела на мяне. Я адразу звярнула ўвагу, што тая не ўсміхаецца. Звычайна, калі дзеці сустракаюцца, яны хаця б крыўляюцца, махаюць.



# МАРГАРЫТА ЛАТЫШКЕВІЧ

## Ваўкалакі

Неагатычны раман

Працяг. Друкуецца з №1 за 2025 год

***Латышкевіч Маргарыта нарадзілася 19 студзеня 1989 года ў Брэсце. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, працягвала навучанне ў магістратуры і аспірантуры. Працуе ў галіне наратыву камп'ютарных гульняў, жыве ў Полацку. Піша вершы і прозу. Актыўна развіваецца ў жанры міфалагічнага фэнтэзі.***

***Аўтар кніг вершаў «Пульс навальніц», «Там, дзе сэрца», кніг прозы «Яблыкі», «Наш дом», «Уласны крыж», «Лисиный перстенек», «Муры, Том і дырыжаблік», «Вершнікі на дарозе», «Век людзей», «Век песень». Лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі.***

46

Выглядаў Іван Сямёнавіч, мякка кажучы, блага — быццам бледны цень самога сябе, быццам вусцішная начная здань. З тых, што з'яўляюцца ў кашмарах.

Ускудлачаныя валасы, зазвычай так старанна залізаныя назад, бязладна падалі яму на белы, нібы абяскроўлены, твар, і ў пасмах заблытаўся мох, сухое лісце ды ігліца. На шчоках ды падбароддзі закарэлі брыдотныя цёмныя рагі, брудныя рукі са зламанымі пазногцямі ўсё нібы спрабавалі намацаць нешта на дарозе, бязладна паторгваючыся. Усяго ж Арсенцьева калаціла заўважная дрыготка, нібы ад ліхаманкі, і ён тарганууся нават мацней, адчуўшы набліжэнне палясоўшчыкаў.

Франак, адцёршы Соф'ю плячом, тут жа наставіў на Івана Сямёнавіча стрэльбу. Панна бачыла Франакаву шырокую напружаную спіну — ён, здаецца, чакаў, што Арсенцьеў вось-вось перавернецца ў звера, завые, накінецца.

Але той, варты не страху, а шкадобы, ледзь стоячы на карачках, толькі блытана сварыўся. Яго з сілаю штурханулі руляю стрэльбы — і Арсенцьеў, хіснуўшыся, вылаяўся гучней і нават падняў гнеўны твар на палясоўшчыкаў.

— ...да ты хоть знаешь, с кем ты тут?!

— А можа, паночак проста перапіў? — здушана прагаварыў Юзік, але без асаблівай надзеі. Франак гучна чмыхнуў носам, не апускаючы стрэльбу.

— Ага, перапіў. Крывёю вунь заліты.

На гэтых словах Арсенцьеў, ледзь не заваліўшыся набок, сяк-так сеў і, лупаючы вачыма, абмацаў рот. Паднёс руку да вачэй, прынюхаўся, нават міжвольна аблізнуў ссохлыя вусны. І толькі тады, схамянуўшыся, паглядзеў на пахмурнага Франака, пасля на Юзіка. Расфакусаваны позірк ягоны сягнуў, нарэшце, і па маўклівай Соф'і і толькі тады зрабіўся болей-меней асэнсаваным.

І чым болей асэнсаваным, тым болей успуджаным.

— С-со...

# ІНТЭРВ'Ю



# КАЦЯ ЛАБКОЎСКАЯ

## Гімн, хіты і ўласны лэйбл

Дзяўчына, якая ў васямнаццаць гадоў стварыла ўласны лэйбл, піша хіты і збірае залы. У яе 18,1 тысячы падпісчыкаў у Instagram, 12,7 тысячы ў TikTok, тысячы праслухоўванняў на стрымінгах... Мы сустрэліся з Кацяй Лабкоўскай, каб пагаварыць пра тое, як ствараецца гімн для дзяржаўнай структуры, навошта артысту свой лэйбл і чаму музыканты выкарыстоўваюць ШІ ў трэках.

**— У свае васямнаццаць гадоў вы ўжо заснавалі лэйбл «КУЛЬТ». Як гэта атрымалася?**

— Першапачаткова я развівалася як артыстка самастойна і супрацоўнічала з аўтарамі Яўгенам Алейнікам і Юліяй Быкавай. У шаснаццаць гадоў напісала першую аўтарскую песню «Кофейные облака», пасля некаторы час была толькі выканаўцай. Потым здарыўся новы парыў натхнення — вярнулася да напісання тэкстаў і музыкі. Паступова ўсвядоміла, што ўсе ключавыя творчыя працэсы засяроджаны вакол мяне і маёй каманды, і зразумела, што больш няма сэнсу нешта дэлегаваць. Менавіта так мы і прыйшлі да стварэння ўласнай кампаніі — прадзюсарскага цэнтра «КУЛЬТ».

**— Вы згадалі, што напісалі першую песню ў шаснаццаць гадоў. Што падштурхнула да гэтага?**

— О, тое я памятаю добра... Было лета. Сапраўднае лета, калі паветра здаецца густым ад сонечнага святла, а ночы трымаюць цяпло дня. Мне было шаснаццаць, і я закахалася. Эмоцыі перапаўнялі: шчасце, хваляванне, страх, што ўсё скончыцца. У нейкі момант пачала проста запісваць словы. Яны прыходзілі самі, быццам іх падарыла мне лета. Песня атрымалася лёгкай і шчырай — у ёй няма фальшы, адны толькі сапраўдныя пачуцці.

**— Як склалася ваша каманда?**

— Каманда сфармавалася са знаёмых, з якімі мела зносіны ў творчых суполках. Цяпер мы знаходзімся на этапе станаўлення, таму ў штаце ўсяго тры чалавекі: я, дырэктар і бухгалтар. У планах — пашырацца, але пакуль эфектыўна працуем і ў такім складзе.

**— А як ставіцеся да канкурэнцыі?**

— Канкурэнцыя — гэта натуральная частка творчага працэсу. Яна была, ёсць і будзе. На сваім шляху мы сустракаем розных людзей, якія задаюць пэўны ўзровень якасці.

# «АКТАВА»

Празаічныя спробы

Літаб’яднанне «Актава» было створана пры ДУДА «Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Барысаўскага раёна» ў канцы 2019 года. Да гэтага ў Барысаве не існавала моладзевага літаратурнага аб’яднання. Агульны плён творчасці калектыву — выданне літаратурнага альманаха «Актава». З гэтым праектам пад назвай «Маладзёжны выдавецкі цэнтр» літаб’яднанне ў 2024 годзе перамагло ў абласным конкурсе гуманітарных праектаў, які ладзіў дэпартамент па гуманітарнай дзейнасці Кіравання справамі Прэзідэнта РБ.

Кожны год у «Актаву» прыходзяць новыя ўдзельнікі. Яны паспяхова выступаюць на абласных і рэспубліканскіх літаратурных конкурсах. Напрыклад, у «Юных талентах Беларусі» ў намінацыі «Паэзія» першыя месцы займалі Андрэй Рашэтнікаў, Аляксандра Сяргеева, Анастасія Ткачэнка, Ганна Аброськіна, Ліза Дарашук і інш. Лаўрэатамі рэспубліканскага паэтычнага конкурсу імя Міколы Мятліцкага сталі Васіль Лайкоў, Вераніка Лайкова, Максім Хацкевіч. У «Славянскім калейдаскопе — 2026» перамаглі Васіль і Вераніка Лайковы. У 2025 годзе Максім Хацкевіч выдаў сваю кніжку «Музыка хваляў і ветру» і быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Яркую творчую індывідуальнасць праяўляюць Сяргей Фралоў, Мікіта Мішчанка, Аляксандр Пастушкоў, Маргарыта Марцінчык, Міхаіл Помаз, Паліна Шкрабко, Алёна Пабатаева.

«Актавіянцы» актыўна прэзентуюць сваю творчасць у бібліятэках, школах, каледжах, музеях, рэалізуюць шматлікія музычна-літаратурныя праграмы. Яны з’яўляюцца ўдзельнікамі такіх свят, як Дзень беларускага пісьменства, Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, Мінская міжнародная кніжная выстава-кірмаш, бяруць удзел у духоўна-асветніцкай экспедыцыі «Дарога да святыняў».

Сёння літаб’яднанне «Актава» вядомае не толькі ў Барысаве, але і далёка за яго межамі. З ім супрацоўнічаюць літаратурныя арганізацыі Мінска і Мінскай вобласці, а таксама некаторых гарадоў Расійскай Федэрацыі, напрыклад, Ульянаўска і Варонежа. Маладыя творцы краін-суседак пазнаёміліся дзякуючы праекту «Бібліятэка без межаў».

У калектыва шмат творчых задум. Гэта і асабісты выдавецкі цэнтр, і свая літаратурная інтэрнэт-праграма. Мы ведаем, што ўсё атрымаецца, таму што «Актава» адкрывае свету новыя таленты, а таленты адкрываюць свету «Актаву».

жосць адзінства» і абавязкова — помнік вядомай на ўвесь свет рагачоўскай згушчонкі.

І ўсё ж такі гэты горад зусім нядаўна рэальна вырашыў прыцягнуць нас да сябе. Дырэктар Рагачоўскага малочна-кансервавага камбіната Уладзімір Аляксандравіч Луцкі 21 лютага 2026 года запрасіў на сустрэчу з працоўным калектывам аўтараў кнігі «Наш Прэзідэнт». Цікавасць да гэтага выдання ва ўсіх чытачоў вялікая. Аўтары прэзентавалі кнігу ў міністэрствах і ведамствах, ва універсітэтах і бібліятэках, кіраўнікам прадпрыемстваў і грамадскаму актыву, але ў гэтым выпадку выступленне ўпершыню павінна адбыцца перад работнікамі аднаго прамысловага прадпрыемства. На сустрэчу прыйшлі ўсе вольныя ад несупыннай вытворчасці спецыялісты: ад слесараў і наладчыкаў да тэхнолагаў і кіраўнікоў.

Аўтарскі калектыў мы прадстаўлялі ўдвух з Аляксандрам Мікалаевічам Карлюкевічам. Нас слухалі так уважліва, што складвалася адчуванне адзінага з залай дыхання. Людзям цікава ўсё, што звязана з Прэзідэнтам: над якімі задачамі ён працуе, як прымае рашэнні, як выхаваў у сабе лідарскія якасці, які ён у звычайным жыцці. Былі і пытанні, і выступленні — але гэта выглядала вельмі тактоўна, хаця і прыкметна эмацыянальна. А пасля шмат хто з прысутных у зале падышоў да аўтараў выказаць Прэзідэнту сваю падтрымку, пажаданні моцнага здароўя, волі і рашучасці ў прыняцці няпростых дзяржаўных рашэнняў.

Пасля сустрэчы з людзьмі Уладзімір Аляксандравіч прадэманстраваў нам асартымент усёй прадукцыі, якую выпускае камбінат, і правёў па тэрыторыі прадпрыемства. Паказаў сучасныя вытворчыя карпусы і даваеннага часу будынкі, якія цудам захаваліся. Усё адрэстаўраванае, дагледжанае, задзейнічана для вытворчых патрэб. Пакланіліся мы і помніку — бляшанцы згушчанага малака ў традыцыйных сіне-блакітных колерах.

Пераклаў з рускай мовы Алесь Карлюкевіч

Фота Аксаны Казловай

# АСОБА

Паэзія Віктара Гардзея (1946—2025) заўсёды ацэньвалася вельмі высока. Хаця яе гучанне і не атрымала належнага (адэкватнага свайму эстэтычнаму ўзроўню і зместаваму напаўненню) розгаласу і папулярнасці. Думаецца, галоўнымі тут сталі некалькі ўзаемазвязаных фактараў:

- знешне суцэльнае дамініраванне акадэмічнасці і традыцыяналізму, што ў выніку стварыла агульнае ўражанне някідкасці ў рэпрэзентацыйнасці творчасці названага паэта;
- тэматычна-праблемная складанасць вершаў, якая не спрыяла прыцягненню масавага чытача, за рэдкім выключэннем філасафічна настроенага рэцыпіента;
- інтэлектуальна-вытанчаная нюансіроўка вобразнага мыслення, што таксама патрабавала грунтоўнай падрыхтоўкі, чаму не заўсёды маглі даць рады нават прафесіяналы-філолагі;
- камернасць інтанацый і нават інтымнасць паэтычнага голасу, адсутнасць мастацкіх эфектаў, што скіроўвала асноўную чытацкую плынь міма Гардзеевай творчасці;
- адсутнасць сістэмнай падтрымкі на ўзроўні філалагічнай адукацыі і ўвогуле прамацыйнасці (з канца XX ст. без яе аніяк).

Тым не менш акурат першы з названага шэрага пунктаў у багатай паэтычнай спадчыне разгледжанага аўтара засланяе адваротныя з'явы, якія ў яго вершах прысутнічаюць рэгулярна (хоць і не займаюць шмат месца). Іх можна назваць эксперыментатарскімі. Не, В. Гардзей не дайшоў да такой ступені арыгінальнічання ў сваім версіфікатарстве, каб яго можна было назваць паэтам-авангардыстам. Паводле бачання Алега Лойкі,

# Нетрадыцыйныя рыфмы і рытмы традыцыйнага паэта

Да 80-годдзя «маладосцеўца» Віктара Гардзея



якое хоць і адносіцца да пачатку творчага шляху паэта, але ў выніку аказалася слушным стасоўна ўсёй творчасці, «В. Гардзей менавіта традыцыяналіст у тым сэнсе, што ён прытрымліваецца рэалістычна-канкрэтнай паэтыкі, рэгулярнага сілаба-тэхнічнага (так у публікацыі, відавочна, трэба «танічнага».— *А. Т.*) верша». Яшчэ больш ёмка пра паэзію В. Гардзея на аснове аналізу яго першых дзвюх паэтычных кніг выказаўся прыяцель Віктар Ярац, адзначыўшы паэтаў творчы метад як «шлях рэалістычнага адлюстравання ў пластычным радку». Зрэшты, пра пазнейшыя вершы гаварылася крытыкай (у дадзеным выпадку Алесем Бадаком) тое самае: «...Паэзія В. Гардзея — класічная: сваёй запаволенай манерай апавядання, мернасцю, эмацыянальнай афарбоўкай, сваёй увагай да дэталяў, сваім гарманічным яднаннем душы лірычнага героя і свету. <...> Пошук яркай метафары для паэта ніколі не з'яўляўся самамэтай. Часта ён абыходзіцца наогул без яе. Як і не ганіцца за арыгінальнай рыфмай, не шукае для сябе нейкія новыя формы, лічачы, пэўна, што яны толькі абцяжарваюць радок, засланяюць сабой думку і не даюць як след перадаць інтанацыю твора». Але і ў наяўнасці нестандартных момантаў яму таксама не адмовіць.

Хаця першай сваёй кнігай «Касавіца» (1975) паэтаў традыцыяналізм настолькі, месцамі да банальнасці, быў моцны, што наўрад ці можна было б спрагназаваць эвентуальнасць у прынцыпе супрацьлеглых элементаў. Хіба можна было іх разгледзець за тымі самымі нярэдкімі дзеяслоўнымі рыфмамі? Дый рыфмаванне аднакарэнных слоў «на поўню — напоўніў» зусім не выяўляла патэнцыял версіфікацыйнай самабытнасці аўтара. У акрэсленым аспекце не адзначыўся і другі (калі лічыць кнігу для дзяцей, трэці) паэтычны зборнік «Верасное палясоўе» (1978). Зрэшты, угар эпохі застою мог не пакінуць опцыі для мадэрнісцкіх замашак, тым больш для паэта-пачаткоўца (хаця, з іншага боку, якраз у той час і ўзыходзіла зорка авангардыста Алеся Разанава (1947—2021), аднак, як мы ўсе помнім, не без праблем і перашкод).

Разам з тым першыя крокі В. Гардзея па паэтычнай ніве засведчылі безумоўны рост яго як майстра вершаскладання (выносім за дужкі зместавы бок твораў, але і ў дадзеным плане адчувалася мастакоўская і жыццёвая сталасць). Тыя ж рыфмы станавіліся ўсё больш адточанымі і разнастайнымі. У далейшым, натуральна, у сваіх тэхнічных пошуках паэт удасканаленнем толькі клаўзул не абмежаваўся.

Ці не першым пасажам, які з поўным правам варта залічыць, прынамсі, у спробы эксперыментавання, з'яўляецца верш, які адносіцца да разраду лірыкі кахання (якое ж яшчэ пачуццё магло падштурхнуць паэта на неардынарны крок?!) са зборніка «Засевак Радзімы» (1978):

А няўжо між кляноў
не са-
грэшана?
Запрашалі ж даўно ў
лес а-
рэшыны.

Наогул, у вершы не знойдзем прамой адсылкі да пачуцця кахання, няма ні слова і пра яго носьбітаў ці хаця б лірычнага героя. Аднак у моцных пазіцыях — у пачатку